

## «НАМ НЕАБЫЯКАВА, ЯК ТАМ БУДУЦЬ РАЗВІВАЦЦА ПАДЗЕІ І ЧЫМ ГЭТА СКОНЧЫЦЦА»

**У працягу інтэрв'ю амерыканскай тэлекампаніі Прэзідэнт адказвае на пытанні па сітуацыі вакол Украіны**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 СНЕЖНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 244 (30632)

# ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

Сёння распачынаецца другое пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу — найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя. На парадку дня — абмеркаванні і рашэнні, датычныя будучыні краіны і кожнага яе грамадзяніна. У першы дзень УНС Прэзідэнт звернецца з Пасланнем да беларускага народа і парламента, а заўтра дэлегаты УНС зацвердзяць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады.




У найбліжэйшых нумарах газеты, а яшчэ раней на сайце zviazda.by і ў сацыяльных сетках мы раскажам і пакажам вам усе падрабязнасці.

Працяг тэмы на стар. 7–10

Фота Лізаветы ГОЛАД.



«ВЯЛІКІ ПЕРАПЫНАК»
+TV ПРАГРАМА

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X



Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «МЫ ГРАНІЧЫМ З ГЭТЫМ КАНФЛІКТАМ, ЯК ТАМ БУДУЦЬ РАЗВІВАЦЦА ПАДЗЕІ

## Працяг інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі

У гэтым блоку пытанняў, якія Прэзідэнту Беларусі задавала вядучая праграмы «Хроніка з Грэтай Ван Састэрэн» тэлеканала «Ньюсмакс ТВ» тэлекампаніі «Ньюсмакс» Грэта Канвей Ван Састэрэн, краўнік дзяржавы падзяліўся сваім бачаннем перспектыў урэгулявання расійска-ўкраінскага канфлікту і ролі ў гэтым працэсе амерыканскага лідара.



### «ЦЯПЕР ВЕЛЬМІ МНОГАЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ПАЗІЦЫІ ТРАМПА І ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ»

Кажучы аб мірным урэгуляванні сітуацыі ва Украіне, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што калі б гэта залежала толькі ад Прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, то з улікам яго цяперашняй палітыкі вайна даўно ўжо скончылася б. Пры гэтым беларускі лідар указаў на два канфліктуючыя бакі — Расію і Украіну. «Ну і нас жа туды яшчэ далучылі — Беларусь, — дадаў ён. — Мы graнічым з гэтым канфліктам, і нам таксама неабыякава, як там будуць развівацца падзеі і чым гэта скончыцца. Таму гэта шматбаковы працэс. І адзін Трамп гэта пытанне не вырашыць».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб сваёй тэлефоннай размове з Дональдам Трампам перад яго сустрэчай з Прэзідэнтам Расіі на Алясцы ў жніўні гэтага года. Падчас размовы беларускі лідар папярэджваў свайго амерыканскага калегу аб тым, што трэба настроіцца на цяжкую работу.

**«З наскоку, як у нас гавораць, вырашыць гэту праблему не атрымаецца, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. —Так яно і адбываецца. Я тады параіў яму прыкласці ўсялякія намаганні, каб дамовіцца з Расіяй спыніць вайну. Стральбу трэба спыніць на фронце і спыніць усялякі рух у кірунку вайны. А калі няма стральбы, калі не гінуць людзі, аб чым Трамп пастаянна гаворыць, тады можна размаўляць і месяц, і два, і гады».**

У сувязі з гэтым Прэзідэнт правёў аналогію з Расіяй (раней СССР) і Японіяй. Па яго словах, мірны дагавор паміж краінамі не заключаны дагэтуль, але гэта не перашкаджае ім супрацоўнічаць на працягу дзесяцігоддзяў.

«Таму галоўнае сёння — спыніць бойню, каб не гінулі людзі, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Зрабіць так, каб ніхто не быў насцярожаны, што вось мы спынілі канфлікт у той перыяд, калі Расія перамагае, гэта сапраўды так. Каб у Расіі не было насцярожанасці ў гэтым плане, трэба зрабіць усё, каб Украіна і яе армія не пераўзбройвалася ў гэты час, каб амерыканцы не пастаўлялі туды зброю разам з еўрапейцамі, — замарозіць гэты канфлікт ад пачатку да канца. Людзі не гінуць — тады садзіцеся і дамаўляйцеся аб чым заўгодна. І тэрытарыяльна, і яшчэ неяк. Галоўнае — спыніць гібель людзей».

Па словах кіраўніка дзяржавы, многае ў гэтым плане залежыць ад Дональда Трампа. У гэтай сувязі ён нагадаў аб мірных перагаворах па Украіне, якія праходзілі ў Мінску ў 2015 годзе, і аб «дурной пазіцыі» еўрапейскіх палітыкаў.

«Яны (еўрапейцы. — **«Зв.»**) хацелі зрабіць так, каб ва ўкраінцаў, як потым Меркель (экс-канцлер Германіі Ангела Меркель. — **«Зв.»**) заявіла, быў час пераўзброіцца і даць адпор Расіі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Аказваецца, не аб міры прыехалі сюды дамаўляцца, а аб будучай вайне. Дагавор тады быў заключаны. Пасрэднікамі, можна сказаць, былі еўрапейцы — Германія і Францыя. Чым гэта скончылася? Нічым.

**Я тады прапаноўваў у гэту кампанію ўключыць амерыканцаў. Без Амерыкі ніякага там міру не будзе. Калі б тады былі рэалізаваны пагадненні, якія былі дасягнуты тут, у Мінску, вайны не было б».**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі б Дональд Трамп у той час узначальваў ЗША і праводзіў сваю цяперашнюю палітыку, то ён не быў бы ўбаку і вайны, хутчэй за ўсё, удалося б пазбегнуць. «Цяпер вельмі многае залежыць ад пазіцыі Трампа і Злучаных Штатаў Амерыкі, вельмі многае, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Галоўнае, каб Трамп ад гэтай пазіцыі не адступіў. Ён чалавек з характарам, часам імпульсіўны. Каб ён не плюнуў на гэта ўсё, рукой не махнуў і не сышоў убок. Калі ён будзе настойліва рухацца ў гэтым плане, значыць, вынік будзе. Еўрапейцам няма чаго тут гвалтам крычаць».

### «КАЛІ ДАЛЕЙ ТАК ВАЯВАЦЬ, ТО УКРАІНА НАОГУЛ ЗНІКНЕ З КАРТЫ, НАОГУЛ ПЕРАСТАНЕ ІСНАВАЦЬ»

Адказваючы на пытанне, чаго ў цяперашняй сітуацыі хоча Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, беларускі лідар з упэўненасцю адзначыў, што Пуцін хоча міру. «Не буду называць прычыны, вы іх добра ведаеце, — дадаў ён. — Гэта і ўнутраныя прычыны, і знешнія. Тое ж самае хоча і Зяленскі. Упэўнены. Асабліва цяпер. Ён хоча міру. Але іх погляды на тое, чым павінна скончыцца вайна, розныя».

Аляксандр Лукашэнка падтрымлівае пазіцыю амерыканскага лідара, які гаворыць аб тым, што ў пытанні спынення канфлікту ва Украіне трэба зыходзіць з рэалій — выніку гэтай вайны на сёння. «Калі Украіна лічыць, што яна можа перамагчы Расію і гатова весці вайну, ну няхай ваюе, — адзначыў Прэзідэнт. — З майго пункту гледжання (думаю, і Трамп прытрымліваецца такой пазіцыі), калі далей так ваяваць, то Украіна наогул знікне з карты, наогул перастане існаваць».

Але самае небяспечнае, па меркаванні беларускага лідара, калі будуць працягвацца гэты канфлікт і эскалацыя, то гэта ўвогуле можа цяжка скончыцца для Еўропы і для свету ў цэлым.

**«Гэта абавязкова перарасце ў які-небудзь глабальны канфлікт, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Таму яго трэба патушыць, пакуль магчыма. Цяпер як ніколі ёсць такая магчымасць, калі амерыканцы сур'ёзна падключыліся да гэтага пытання.**

Гэта найважнейшае ваша знешнепалітычнае пытанне. Ніякія Тайвань, іншыя канфлікты ў свеце і праблемы не могуць перакрыць гэта пытанне, бо, паўтараю, працяг канфлікту прывядзе да глабальнага канфлікту. З прымяненнем усіх узбраенняў, якія ёсць у краін. Гэтага дапусціць нельга».

### «КАЛІ ТЫ ЖЫВЕШ ПОБАЧ З «МЯДЗВЕДЗЕМ, ЯКІ СПІЦЬ», НЕ БУДЗІ ЯГО»

Грэта Канвей Ван Састэрэн пацікавілася меркаваннем кіраўніка беларускай дзяржавы наконт таго, чаму Прэзідэнт Расіі пачаў ваенныя дзеянні ва Украіне і да чаго імкнуўся. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сукупнасці прычын, якія прывялі да канфлікту. І каб гэта было зразумела амерыканскай аўдыторыі, прывёў у прыклад Мексіку, якая знаходзіцца побач з ЗША.

«Калі б у Мексіцы пачалі прымушаць амерыканцаў, якія там, асабліва ў прыгранічны, жывуць, і праамерыканскі настроеных людзей размаўляць, скажам, на іспанскай мове, а не англійскай, іх дзяцей «прыдушваць» у школе, каб яны размаўлялі толькі на іспанскай мове, і гэтак далей; або, не дай Бог, у доме дзе-небудзь спалілі амерыканцаў у Мексіцы, вы як бы паступілі? — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. — Вы зрабілі б усё, каб сцерці Мексіку з зямлі. Не дай Бог, вядома».

Па словах Прэзідэнта, эскалацыя пачалася з прыцяснення ва Украіне рускамоўнага насельніцтва. Ён заўважыў, што калі ўкраінскім уладам сапраўды хацелася выбудаваць пэўную моўную палітыку, то гэта трэба было рабіць спакойна і паступова. Але, па словах беларускага лідара, было вырашана проста «заткнуць рот» рускамоўнаму насельніцтву.

«Больш за тое, у Адэсе (вы гэта ведаеце, гэта факт) яны спалілі людзей, якіх лічылі сваімі ворагамі, так званых рускамоў-

# І НАМ ТАКСАМА НЕАБЫЯКАВА, І ЧЫМ ГЭТА СКОНЧЫЦЦА»

## амерыканскай тэлекампаніі «Ньюсмакс»

ных, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта палітыка была ўзведзена ў ранг ва Украіне.

**Ну і потым, гавару вам як стары палітык: калі ты жывеш побач з гэтым «мядзведзем, які спіць», ну не будзі яго, знайдзі нармальныя адносіны, каб суіснаваць.**

Бо пры мне было (я гэта ведаю, бачыў, удзельнічаў у гэтых перагаворах): Расія дамовілася з Украінай і па пытаннях Крыма, і па пытаннях бяспекі, і па тым, што ў Крыме ваенныя базы (яны Украіне не патрэбныя былі) будуць расійскімі. Расія пастаўляла ў два разы танней энергарэсурсы Украіне, чым яны каштавалі ў свеце. Я бачыў гэта пры Ельцыне і пры Пуціне. Былі нармальныя адносіны. Не, трэба было зладзіць (не без дапамогі амерыканцаў і асабліва еўрапейцаў) гэты Майдан. Перавярнулі ўсё, звергі дзеючага Прэзідэнта — ён (Віктар Януковіч. — **«Зв.»**) вымушаны быў пакінуць краіну».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што прычын канфлікту ва Украіне можна назваць шмат і яны будуць не на карысць Украіне.

### «ЗА КРЫМ НІХТО НЕ ЗМАГАЎСЯ»

Інтэрв'юер заўважыла, што, па сцвярджэнні ўкраінскага боку, вайна ва Украіне ў 2014 годзе пачалася з Крыма.

«Ніякай вайны ў Крыме не было, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Сёння Зяленскі і ўлады ўкраінскія гавораць, што Крым украінскі. Крым — гэта наогул жамчужына. Каму б ён ні належаў, гэта жамчужына, гэта райскі куток. Яны гавораць, што вайна пачалася... Вайна — калі лоб у лоб са зброяй у руках ваююць два бакі. У Крыме не было ні аднаго выстралу з боку ўкраінцаў. Ну а расіянам навошта было страляць, калі яны вызвалілі, як яны гавораць, Крым? Страляць не трэба было, бо за Крым ніхто не ваяваў. За Крым ніхто не змагаўся. Гэта было на маіх вачах».

Адказваючы на ўдакладненне журналіста, што Расія анексіравала Крым, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што можна казаць як заўгодна — «анексіравалі», «вызвалілі», «захапілі». «Гэта філасофскае пытанне, — канстатаваў ён. — Не ў гэтым справа.

**Але калі гэта твая зямля, ты чаму не абараняў гэту зямлю? Украінцы яе аддалі. Яны яе проста аддалі расіянам.**

Я калісьці пра гэта гаварыў, што там расіяне паступілі разумна: яны дамовіліся з тымі, хто павінен быў абараняць Крым, і такім чынам Крым фактычна быў здадзены «зялёным чалавечкам», як вы іх называлі тады».

### «ЛЮБАЯ ВАЙНА ЗАКАНЧВАЕЦЦА МІРАМ»

Адказваючы на пытанне, як скончыцца вайна ва Украіне, беларускі лідар падкрэсліў, што любая вайна заканчваецца мірам. «Класіка, — заўважыў ён. — І гэта вайна закончыцца мірам. Чым раней, тым менш загіне людзей. Я часта гавару па-мужчынску: ведаеце, ну загінуў і загінуў, а колькі скалечаных людзей з гэтай вайны вяртаецца. З імі як быць? Без ног, без рук. Абмены ідуць на нашай тэрыторыі».

Гаворачы аб тым, як у цяперашніх умовах канфліктуючым бакам дасягнуць міру, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што да гэтага падштурхне абстаноўка, якая складваецца вакол. Ён не выключыў, што эскалацыя можа прывесці да мабілізацыі ў Расіі, яшчэ большага ўцягвання насельніцтва ў гэты канфлікт. «Гэта будзе добра для Расіі? Не будзе добра, — канстатаваў ён. — Ну і потым, Пуцін мне часта аб гэтым гаворыць: «Ваюем адзін супраць аднаго — свае людзі». Тут і псіхалогія, і многія пытанні».

Па словах кіраўніка дзяржавы, Зяленскі павінен разумець і выдатна разумее: працяг канфлікту можа скончыцца тым, што Украіны не будзе. «І вось гэтыя фактары, плюс цісК Трампа на аднаго, на другога, ціск знешні, калі не дамовяцца цяпер, гэты ціск знешні яшчэ больш узмоцніцца, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вось гэтыя фактары ўплываюць на двух прэзідэнтаў. І яны разумеюць, што трэба спыніцца, трэба дамовіцца».

Аднак, па словах кіраўніка дзяржавы, для ўстанаўлення міру ва Украіне патрэбны пэўныя гарантыі. «Расія хоча гарантый, каб гэта было назаўжды, — канкрэтызаваў ён.

**— Я гэта ведаю. Расія хоча заключыць такі мірны дагавор, каб ніколі больш вайна не пачалася. У гэтым зацікаўлена і Украіна.**

Трамп гатовы выступіць гарантам гэтага. Усё ёсць. Таму трэба інтэнсіфікавацца, трэба паскорыцца».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Дональд Трамп у гэтым выпадку больш падціскае Уладзіміра Зяленскага, які не хоча ісці на здзелку. «Чаму не хоча? Бо еўрапейцы ўвязаліся ў гэта, і яны яму нашэптваюць на вуха, што будуць дапамагаць Зяленскаму ваяваць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**— Нічога яны не дапамогуць. У іх няма таго рэсурсу, які ёсць у Злучаных Штатаў Амерыкі. І калі амерыканцы ад гэтага адыдуць, эскалацыі не пазбегнуць. І вось тады Макрон, Мерц і Стармер зразумеюць сваю памылку».**

Калі Дональд Трамп расчаруецца ў перспектывах мірнага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне і адыдзе ад гэтай тэмы, перакананы Аляксандр Лукашэнка, вайна працягнецца. «Вайна працягнецца, пакуль ва Украіне не возьмуць верх сілы, якія прымусяць Зяленскага пайсці на мір, — канстатаваў беларускі лідар. — А гэтыя сілы прымусяць Зяленскага пайсці на мір тады, калі пачне валіцца фронт поўнасцю. Хоць ужо пачатак гэтага бачны цяпер».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

**Працяг тэмы на стар. 4.**



АФІЦЫЙНА

## РОЎНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЎСІХ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 снежня падпісаў Указ № 439 «Аб арэндный плаце за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументам устаноўлены памер такой платы — роўны памеру зямельнага падатку, які вылічваецца ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам. Пры гэтым на плацельшчыкаў арэнднай платы будуць распаўсюджвацца прадугледжаныя Падатковым кодэксам ільготы па зямельным падатку.

Захоўваюцца дзеючыя цяпер тэрміны выплаты арэнднай платы, а таксама тэрміны прадастаўлення юрыдычнымі асобамі сум арэнднай платы ў падатковыя органы.

Дагаворы арэнды будуць прыводзіцца ў адпаведнасць з указам паступова — пры паступленні заяў ад арандатараў, у выпадку прадаўжэння тэрмінаў арэнды зямельных участкаў і пры прыняцці мясцовымі органамі ўлады, адміністрацыямі свабодных эканамічных зон (СЭЗ) рашэнняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі змянення дадзеных у арэнду зямельных участкаў.

31 студзеня 2026 года палажэнні ўказа будуць прымяняцца да ўсіх зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і дадзены ў арэнду мясцовымі выканаўчымі камітэтамі, адміністрацыямі СЭЗ.

Меры, прадугледжаныя ўказам, накіраваны на ўдасканаленне сістэмы спагнання арэнднай платы за зямельныя ўчасткі і стварэнне роўных умоў для ўсіх землекарыстальнікаў незалежна ад віду правоў на зямельныя ўчасткі.

## НОВЫЯ ГЕРОІ СПАРТЫЎНАГА АЛІМПУ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 17 снежня падпісаў Указ № 440 аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2025 года, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

За значны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, спецыяльная прэмія прысуджана Прэзідэнцкаму спартыўнаму клубу, Івану Літвіновічу і Спартаку Мірановічу.

Прэзідэнцкі спартыўны клуб удастоены высокай узнагароды за значны ўклад у развіццё фізкультуры і спорту, рэалізацыю шматлікіх комплексных праграм па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы спартыўных школ і інфраструктуры крокавай даступнасці для заняткаў фізічнай культурай, арганізацыю маштабных спартыўных праектаў і спаборніцтваў.

Майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа Іван Літвіновіч з'яўляецца двухразовым чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў, неаднаразовым пераможцам чэмпіянатаў свету ў камандных спаборніцтвах, сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету, уладальнікам Кубка свету, чэмпіёнам Еўропы ў камандных спаборніцтвах, пераможцам і сярэбраным прызёрам III Гульняў краін СНД 2025 года.

Заслужаны трэнер СССР і БССР Спартак Мірановіч узначальваў мужчынскую зборную Беларусі па гандболе з 1992 да 2008 года. Пад яго кіраўніцтвам восем ігракоў гандбольнага клуба «СКА-Мінск» сталі алімпійскімі чэмпіёнамі ў складзе зборных каманд, зборная СССР па гандболе двойчы заваёўвала золата Алімпійскіх гульняў (1988 і 1992 гады), гандбольны клуб «СКА-Мінск» тройчы станавіўся ўладальнікам Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў (1987, 1989 і 1990 гады), двойчы — Кубка ўладальнікаў кубкаў (1983 і 1988 гады) і Кубка выкліку (2013 год).

# «УСЁ ПАЦВЯРДЖАЕЦЦА ЧАСАМ І ПАКАЗВАЕ РЭАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ»

## Эксперты — пра інтэрв'ю кіраўніка дзяржавы амерыканскаму тэлеканалу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю амерыканскаму тэлеканалу «Ньюсмакс» зноў заклікаў вырашаць планетарныя праблемы за сталом перагавораў, а не вайной. Пра ролю яго палітычных парад у сусветным парадку дня, апраўданасць прагнозаў ад Першага і першапрычыны ўзнікнення канфліктаў на планеце расказалі эксперты.

### ПРА РАСІЙСКА-ЎКРАІНСКІ КАНФЛІКТ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА**, каментуючы інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі амерыканскаму тэлеканалу Newsmax, нагадала, што яшчэ падчас падпісання так званых мінскіх дамоўленасцяў аб спыненні вайны на Данбасе Аляксандр Лукашэнка папярэджваў, што без падключэння да гэтага працэсу Злучаных Штатаў трывалы мір ва Украіне будзе наўрад ці дасягальны:

— На жаль, ні ўкраінскі бок, ні заходнееўрапейскія палітыкі, якія стаялі за ім, да меркавання беларускага лідара тады не прыслухаліся. А дарма, бо ён, як заўсёды, меў рацыю. Сёння мы з'яўляемся сведкамі таго, што менавіта адміністрацыя Дональда Трампа прыкладвае значныя намаганні да таго, каб спыніць кровапраліцце ў зоне правядзення СВА. Якая, як сказаў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне карэспандэнта аб прычынах узнікнення расійска-ўкраінскага канфлікту, стала толькі вынікам той недальнабачнай унутранай і знешняй палітыкі, якую праводзяць улады Украіны пачынаючы з 2014 года. Шмат у чым па падгаворванні і пры падтрымцы сваіх заходнееўрапейскіх партнёраў.

Сенатар звяртае ўвагу на ацэнку Прэзідэнтам намаганняў цяперашняй адміністрацыі Белага дома:

— Невыпадкова Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: калі б усё залежала ад Трампа, вайна б даўно ўжо скончылася, бо гэтага хоча не толькі ён, але і Пуцін, і Зяленскі. Няхай па розных прычынах, але тым не менш. Спыненні вайны хочуць і народы Расіі і Украіны, чые мужы і сыны гінуць на лініі баявога судакранання. Больш за тое, гэтага ж хочуць і жыхары Беларусі, якія з горыччу назіраюць за тым, як каля яе граніц змагаюцца паміж сабой іх кроўныя браты.

І толькі кіраўніцтву ЕС, калі меркаваць па апошніх заявах, выгадны гэты канфлікт. Як па палітычных, так і па эканамічных прычынах, кажа суразмоўніца:

— Сваёй галоўнай мэты яны не хаваюць: калі не атрымліваецца перамагчы Расію на полі бою, яе трэба максімальна аслабіць у ваенным і эканамічным плане. Каб пасля за кошт рабавання яе рэсурсаў вырашыць тыя эканамічныя і сацыяльныя праблемы, якія ў краінах Еўрасаюза нарастаюць як снежны ком.

Але гэта вельмі недальнабачная і небяспечная пазіцыя, пагражае далейшым разрастаннем канфлікту, падкрэслівае парламентарый:

— Менавіта пра гэта папярэджвае Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, кажучы пра цяжкія наступствы для Еўропы і свету ў выпадку магчымай эскалацыі канфлікту.

### ПРА РЭАЛІСТЫЧНАСЦЬ ПРАГНОЗАЎ АД ПЕРШАГА



**Дырэктар прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** ў эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа-радыё» растлумачыла, чаму замежныя журналісты пільна сочаць за кожным словам Аляксандра Лукашэнкі аб ключавых сусветных падзеях:

— Палітык з такім розумам, з уменнем бачыць і прадказваць сітуацыю сёння на планеце сустракаецца вельмі рэдка. Таму зразумела: усё, пра што казаў Аляксандр Рыгоравіч, усё, пра што ён кажа, пацвярджаецца часам і паказвае рэальную палітыку, якую ён праводзіць. Гэта дэманструе яго адкрытасць і разумнасць. Ён — адкрыты і сумленны чалавек.

У пацвярджэнне сваіх слоў яна прыводзіць прыклад:

— Паглядзіце: перад амерыканскімі сродкамі масавай інфармацыі ён не выкручваецца і не спрабуе казаць, што «вы, Амерыка, усё робіце правільна». Ён кажа так, як думае, як бачыць, як адчувае, і не баіцца называць рэчы сваімі імёнамі. Калі Дональд Трамп не мае рацыю, ён адкрыта кажа пра гэта. Калі ён мае рацыю, ён таксама адкрыта заяўляе пра сваю праўду. Ён не баіцца выказацца пра тое, як бачыць сітуацыю і як прапануе яе вырашыць. І час, і гісторыя пацвярджаюць, што яго бачанне часта аказваецца сапраўды правільным.

Таму, робіць выснову госця праграмы, усе хочуць яго пачуць — даведацца, як ён бачыць далейшае развіццё падзей у любой сферы:

— І што датычыцца Венесуэлы, і вайны з Украінай, і таго, што адбываецца ў свеце ў цэлым. Гэта такі прагноз ад Аляксандра Лукашэнкі, які, у добрым сэнсе, усе чакаюць.

Пры гэтым Вольга Шпілеўская адзначае, што Прэзідэнт не навязвае нікому свае парады:

— Ён адказвае на пытанні, якія яму задаюць. І ў сваіх парадах ён абапіраецца на вопыт. Гэта не проста словы, а глыбокі аналіз сітуацыі: ён бачыць, як яна развівалася, як будзе развівацца. Ён абапіраецца на досвед, напрыклад, у той жа барацьбе з наркотыкамі, які быў у нашай краіны. І тут жа ўспамінаецца яго правільная фраза пра тое, што зброяй наркотыкі перамагчы немагчыма. Ён казаў, што гэта глабальная праблема і проста сцерці з твару зямлі Венесуэлу толькі з-за таго, што гэта краіна, праз якую ідзе наркатрафік або якая пастаўляе наркотыкі, няправільна. Бо існуе гісторыя з пастаўкамі сінтэтычных наркотыкаў з еўрапейскіх краін, напрыклад, праз нашу тэрыторыю. І што ж, нам такімі баявымі дзеяннямі, зброяй сціраць з твару зямлі любую краіну, якая, як нам здаецца, уяўляе пагрозу? Так не будзе, і так нельга, таму што тады войны на нашай планеце не скончацца і мы знішчым гэту планету.

### ПРА СІТУАЦЫЮ ВАКОЛ ВЕНЕСУЭЛЫ



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** звяртае ўвагу на падрабязную характарыстыку міжнароднай сітуацыі ў рэгіёне Карыбскага басейна:

— Як вядома, восенню бягучага года афіцыйны Вашынгтон пад надуманай падставай барацьбы з кантрабандай наркотыкаў і з мэтай устанаўлення татальнай блакады партоў Венесуэлы стварыў каля берагоў Паўднёвай Амерыкі магутную ваенна-марскую групоўку. Кіраўніцтва Венесуэлы было абвешчана «замежнай тэрарыстычнай арганізацыяй», а вядучыя масмедыя прыступілі да маштабнай падрыхтоўкі міжнароднай грамадскай думкі да магчымай агрэсіі ЗША супраць гэтай суверэннай лацінаамерыканскай дзяржавы. Адначасова амерыканскія ваенныя заняліся пазасудовымі расправамі над венесуэльскімі маракамі, патапіўшы звыш 20 суднаў разам з экіпажамі.

Такім чынам, робіць выснову эксперт, на вачах ва ўсёй сусветнай супольнасці фактычна ажыццяўляецца падрыхтоўка чарговай ваеннай інтэрвенцыі:

— Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, у заходнім паўшар'і ўзнікла рэальная пагроза ператварэння гэтага канфлікту ў сапраўдную вайну, і гэта нашкодзіць, перш за ўсё, амерыканскім інтарэсам. Выкарыстоўваючы магчымасці тэлекампаніі Newsmax, ён настойліва пераконвае амерыканскі бок устрымацца ад узброенага гвалту ў дачыненні да Венесуэлы.

Суразмоўца нагадвае тэзіс Прэзідэнта аб тым, што дамовіцца разумныя людзі заўсёды могуць і для гэтага маюцца ўсе неабходныя ўмовы:

— Але наўрад ці сёння Вашынгтон гатовы да дээскалацыі сітуацыі ў Карыбскім рэгіёне. Наадварот, становішча ў дадзены гістарычны момант ва ўзаемаадносінах ЗША і Венесуэлы напружваецца з кожным днём.

На думку парламентарыя, асноўная прычына распачатага некалькі гадоў таму канфлікту заключаецца не ў выяўленні чарговага лацінаамерыканскага наркатрафіку, а ў багатай і разнастайнай мінеральна-сыравіннай базы Венесуэлы:

— Краіна валодае велізарнымі разведанымі запасамі нафты і займае першае месца сярод іншых нафтаздабыўных дзяржаў у рэгіёне. Акрамя таго, у яе нетрах выяўлены шырокія запасы газу, залежы каменнага вугалю, жалезных, нікелевых, кобальтавых, тытанавых, марганцавых, медных і цынкава-свінцовых руд, золата, алмазаў, баксітаў, фасфарытаў, урану, серы і азбесту, а таксама іншых рэдкіх металаў. Усе гэтыя прыродныя багацці літаральна намагнічваюць драпежніцкую цікавасць з боку найбуйнейшых транснацыянальных кампаній Глабальнай Поўначы, якія і вызначаюць у канчатковым выніку знешнепалітычную стратэгію Злучаных Штатаў і іх сатэлітаў на лацінаамерыканскім напрамку.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ПАДАТКІ,

## У Савеце

На чарговым пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі асноўная ўвага парламентарыяў была аддадзена законапраектам, якія датычацца рэспубліканскага бюджэту, падатковых праваадносін, пенсіённага забеспячэння і энергазберажэння.

### ЯК ЗМЕНЯЦЦА ПАДАТКАВЫЯ ПРАВААДНОСІНЫ?

Прадстаўляючы законапраект «Аб змене законаў па пытаннях падатковых праваадносін», **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ** патлумачыў: «Пры карэкціроўцы норм Падатковага кодэкса ў бягучым годзе мы не прапануем кардынальных змяненняў. Асноўны акцэнт зроблены на кропкавай наладзе і адаптацыі да ўмоў, зменeных раней. Прадугледжана рэалізацыя базавых, дадатковых фіскальных і іншых мер падатковай палітыкі. Адзін з кірункаў — базавыя штогадовыя меры падатковай палітыкі: індэксацыя на сярэднегадавы прагнозны параметр інфляцыі ставак падаткаў, якія ўстаноўлены ў беларускіх рублях, павелічэнне ставак акцызаў уключна з улікам міжнародных абавязацельстваў у рамках дагавора аб агульных прынцыпах падаткаабкладання па ўскосных падатках паміж Беларуссю і Расіяй».

У сваю чаргу **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Раман БРОДАЎ** адзначыў, што прапанаваныя змяненні накіраваны на павышэнне празрыстасці падатковай сістэмы, павелічэнне паступлення ў бюджэт і ўдасканаленне падатковага адміністравання. «Для бізнесу прадугледжаны як меры падтрымкі, так і новыя патрабаванні. Сістэма падаткаабкладання малога бізнесу будзе аптымізавана. Асаблівая ўвага ўдзяляецца спецыяльным падатковым рэжымам. Для індывідуальных прадпрымальнікаў і самазанятасці грамадзян распрацаваны правілы, накіраваныя на спрашчэнне працэдур пры захаванні кантролю над падатковымі паступленнямі. Гэтыя меры дададуць у бюджэт каля 700 мільёнаў рублёў у год».

ЧАС МАЛАДЫХ

# ВЯЛІКАЯ

## У сталіцы

У аўторак, 16 снежня, адбылася цырымонія прысваення звання маладзёжных паслоў Мэт устойлівага развіцця пераможцам конкурсу «Маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця — будучыня планеты ў нашых руках» 5-га склікання.

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ** адзначыў, што Беларусь з'яўляецца паслядоўным прыхільнікам ідэй і прынцыпаў, якія закладзены ў Парадак дня ААН па дасягненні Мэт устойлівага развіцця на перыяд да 2030 года. «Сённяшняе мерапрыемства — гэта яшчэ адна магчымасць паказаць, у прынцыпе, як у нас выбудаваны нацыянальны механізм рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця, — сказаў Уладзіслаў Татарыновіч. — Паводле ацэнкі экспертнай супольнасці, мы займаем 32-е месца па

# БЮДЖЭТ І МІЖНАРОДНЫЯ ПАГАДНЕННІ

## Рэспублікі адобрылі шэраг важных законапраектаў



Паводле яго слоў, прыняцце закона дасць магчымасць забяспечыць збалансаванасць бюджэту, сацыяльную справядлівасць падаткаабкладання, не дапускаючы пры гэтым празмернай нагрузкі на эканоміку. «Для ўстойлівага развіцця эканомікі мэтавы індыкатар па падатковай нагрузцы не павінен перавышаць 20 % ад ВУП. Пры гэтым ён павінен забяспечвацца не за кошт увядзення новых падаткаў, а за кошт павышэння іх збіральнасці і пашырэння падаткаабкладальнай базы. Гэта патрабаванне ў праекце закона выконваецца. Прадстаўлены дакумент адпавядае Канстытуцыі, патрабуе нарматворчай тэхнікі і не супярэчыць нацыянальным інтарэсам», — падкрэсліў Раман Бродаў.

### ПРАЕКТ БЮДЖЭТУ ФАРМІРАВАЎСЯ ВА ЎМОВАХ, ЯКІЯ ПАТРАБУЮЦЬ АСАБЛІВАЙ АДКАЗНАСЦІ

З улікам планаваных мер падатковай палітыкі, зыходзячы з параметраў развіцця эканомікі на будучы год, якія пацверджаны ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сфарміраваны падыходы рэспубліканскага бюджэту і разліковыя паказчыкі па мясцовых бюджэтах, заявіў міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў. Паводле яго слоў, даходы кансалідаванага бюджэту на 2026 год ацэньваюцца ў 92,1 мільярда рублёў (плюс 9,7 мільярда рублёў да ацэнкі 2025 года).

«Даходы кансалідаванага бюджэту на 2026 год уключаюць падатковыя даходы ў суме 76,4 мільярда рублёў, або 82,9 % у агульнай структуры даходаў, непадатковыя даходы 9 мільярдаў рублёў, або 9,8 %, а таксама бязвыплатныя паступленні, — канкрэтызаваў кіраўнік фінансавага ведамства. — Асноўны прырост даходаў кансалідаванага бюджэту будзе забяспечаны за кошт падатку на дабаўленую вартасць — 2,5 мільярда рублёў, падаходнага падатку — 2,3 мільярда рублёў, падатку на прыбытак — 1 мільярд рублёў, а таксама падатковых даходаў ад знешнеэканамічнай дзейнасці. Таксама ў складзе даходаў улічаны дадатковыя паступленні ад раней прынятых адкладзеных падатковых мер».

У сваю чаргу Раман Бродаў адзначыў, што праект бюджэту фарміраваўся ва ўмовах, якія патрабуюць асаблівай адказнасці, дальнабачнасці пры не самай простай знешняй кан'юнктуры. «За аснову прыняты сцэнарый сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджаны Указам кіраўніка дзяржавы 3 лістапада 2025 года. Даходы рэспубліканскага бюджэту за 2026 год запланаваны ў аб'ёме 54,4 мільярда рублёў. Больш важным з'яўляецца той факт, што даходы растуць з тэмпамі 112 % ад чаканага ўзроўню 2025 года, апераджальнымі тэмпамі ў параўнанні з выдаткамі».

Пры гэтым выдаткі рэспубліканскага бюджэту — 58,7 мільярда рублёў. «42 % выдаткаў кансалідаванага бюджэту будуць сканцэнтраваныя ў сацыяльнай сферы. Гэта цалкам адпавядае традыцыйнаму арыенціру дзяржавы на павышэнне якасці жыцця людзей», — адзначыў Раман Бродаў.

### РАТЫФІКАЦЫЯ ПАГАДНЕННЯЎ З КРАІНАМІ ГЛАБАЛЬНАГА ПОЎДНЯ

У ходзе сесіі таксама былі адобраны праекты законаў «Аб змяненні законаў па пытаннях пенсіённага забеспячэння», «Аб змяненні законаў па пытаннях індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасці», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб энергазберажэнні». Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей АЛЕЙНІК**, у ходзе сесіі былі разгледжаны і адобраны 7 законапраектаў, што датычацца ратыфікацыі дагавораў міжнароднага, інтэграцыйнага характару і двухбаковых дакументаў, якія рэгулююць прававыя адносіны з краінамі глабальнага Поўдня. «Мы разгледзелі два найважнейшыя, на маю думку, дакументы. Гэта часовае гандлёвае пагадненне паміж дзяржавамі — членамі ЕАЭС і Манголіяй, якое стварае больш прэферэнцыйныя рэжым узаемнага гандлю з гэтай краінай. І, вядома, мы разлічваем, што ратыфікацыя гэтага пагаднення дазволіць нам істотна нарасціць аб'ёмы ўзаемнага гандлю з гэтай краінай, — адзначыў Сяргей Алейнік. — У панядзелак мы правялі сустрэчу з сустаршынёй групы парламенцкай дружбы, абмеркавалі ўвесь комплекс двухбаковых адносін, уключаючы рэалізацыю тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты ў рамках візіту Прэзідэнта Беларусі ў Манголію ў чэрвені мінулага года. Таксама намецілі канкрэтныя крокі па павелічэнні ўзаемнага гандлю, па рэалізацыі кааперацыйных праектаў і гэтага пагаднення».

Яшчэ адзін важны дакумент, на якім акцэнтаваў увагу сенатар, — праект Закона «Аб ратыфікацыі пагаднення аб эканамічным партнёрстве паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і яго дзяржавамі-членамі з аднаго боку і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі з другога боку». Паводле яго слоў, ААЭ з'яўляюцца нашым ключавым партнёрам на Блізкім Усходзе ў зоне Персідскага заліва. «Эміраты ўваходзяць у тройку найбуйнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі, і мы ўпэўнены, што гэта пагадненне стварыць больш спрыяльныя, прэферэнцыйныя ўмовы для нашых суб'ектаў гаспадарання ў плане прасоўвання беларускай прадукцыі на рынак Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і праз ААЭ — у іншыя рэгіёны свету, перш за ўсё ў іншыя краіны Блізкага Усходу і Афрыкі», — рэзюмаваў Сяргей Алейнік.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

# АДКАЗНАСЦЬ І МАГЧЫМАСЦЬ ПРАЯВІЦЬ СЯБЕ

## ўшаноўвалі новы склад маладзёжных паслоў Мэт устойлівага развіцця

дасягненні Мэт устойлівага развіцця са 167 дзяржаў. І ўклад маладых людзей у гэта дасягненне неацэнны. Статус «Маладзёжнага пасла МУР» унікальны. З аднаго боку, гэта добрая магчымасць паказаць свае самыя лепшыя якасці, а з другога боку, гэта вялікая адказнасць».




Па яго словах, матываваныя, адукаваныя і актыўныя маладыя людзі з'яўляюцца залогам паспяховага развіцця любой дзяржавы, яе стратэгічным рэсурсам. «Прадстаўнікі беларускай моладзі праяўляюць актыўнасць ва ўсіх сферах жыцця грамадства, робяць істотны ўнёсак у нарошчванне эканамічнага патэнцыялу нашай краіны, павышэнне яе палітычнага аўтарытэту, адстойваюць гонар Радзімы на міжнародных спартыўных спаборніцтвах і культурных конкурсах, распрацоўваюць навуковыя праекты і ўдзельнічаюць у сацыяльна значных ініцыятывах. Да такіх прадстаўнікоў адносяцца маладзёжныя паслы Мэт устойлівага развіцця, якіх мы сёння пасвячаем у гэты статус», — дадаў намеснік Старшыні Савета Рэспублікі.

Маладзёжны пасол Мэт устойлівага развіцця, **студэнт эканамічнага факультэта БДУ Яўген ТАЛОЧКА** прадстаўляе Мэту № 2 — «Ліквідацыя голаду». Сваёй галоўнай задачай малады чалавек лічыць прыцягненне актыўнай моладзі, якая зацікаўлена ў вырашэнні гэтага хвалюючага пытання. «Мэта № 2, як і астатнія іншыя, важная для нас усіх. Сумеснымі намаганнямі шмат што можна дасягнуць!» — запэўніў пасол.

**Студэнт БДУТ Сцяпан МОЛЧАН** выбраны Маладзёжным паслом Мэты № 11 — «Устойлівыя гарады і населеныя пункты». Малады чалавек з дзяцінства марыў звязаць сваё жыццё з транспартам. Цікавасць да гэтай галіны эканомікі натхніла юнака на ідэі, як зрабіць яе яшчэ больш камфортнай. «Інфраструктура ў нашай краіне, на мой погляд, развіта вельмі добра. Ды ўстойлівы горад — не толькі інфраструктура, але і людзі, якія ў ім пражываюць. Дапамога пажылому чалавеку, напрыклад, у набыцці квітка на электрычку ў тэрмінале. Я прапанаваў канцэпцыю, якая здолее аб'яднаць людзей, іх намаганні для больш камфортнага жыцця».

Юнак расказаў, што ва ўніверсітэце да Дня пажылога чалавека праводзілася акцыя «Даступны білет». Са студэнтамі сваёй навучальнай установы ён дапамагаў пажылым набываць квіткі праз тэрміналы самаабслугоўвання. «Для пажылых людзей гэта можа быць праблематычна. Цяпер на некаторых прыпынках няма кас, адпаведна, пажылыя людзі садзяцца ў цягнік і купляюць квіткі ў раз'язнога касіра з невялікай нацэнкай. І наша акцыя не столькі дапамагла зберагчы грошы, колькі стала маральнай падтрымкай для пажылых людзей, якія цяпер не перажываюць пра тое, дзе купіць білет. Мы вучым іх карыстацца тэрміналамі і тым самым робім інфраструктуру больш даступнай», — падзяліўся Сцяпан.

На кожную з 17 Мэт устойлівага развіцця быў выбраны пасол і дублёр. **Сафія ВАСІЛЬКОВА** ўзначальвае Мэту № 16 — «Свет, правасуддзе і эфектыўныя інстытуты». «Я планую ажыццявіць канцэпцыю, якую абараняла на вочным этапе адбору на конкурс. Закранаючы тэмы прававой асветы, асабліва ў маладзёжным асяроддзі, мне хацелася б прыўнесці ідэю «Роўны навучае роўнага». Мы праводзім дыялогавыя пляцоўкі, планую яшчэ адукацыйную дзелавую гульню сярод студэнтаў ВНУ нашай краіны», — падзялілася планамі дзяўчына.

Напярэдзе ў маладзёжных паслоў два гады работы над рэалізацыяй сваіх мэт. **Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Расул БАГІРАЎ** падкрэсліў важнасць наяўнасці людзей, здольных даступна растлумачыць іншым, чаму ўстойлівае развіццё мае значэнне і як кожны з нас можа ўнесці свой уклад. «Існуе мноства ініцыятыў, у якіх удзельнічае моладзь, іх немагчыма пералічыць усе. Ініцыятыўныя юнакі і дзяўчаты робяць каласальную працу», — адзначыў ён.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

# ПЛЮС У КАШАЛЁК

## Рэальныя даходы насельніцтва Беларусі за пяць гадоў выраслі больш чым на 23 %

Пра гэта заявіў міністр эканомікі Юрый Чабатар у інтэрв'ю тэлеканалу «Першы інфармацыйны», паведамляе БелТА.

— Пры распрацоўцы праграмы на 2026—2030 гады мы паглядзелі, а як жа ўсё ж такі развівалася наша краіна за папярэдняе пяцігоддзе, наколькі мы выканалі тыя задачы, якія прапісвалі ў пяцігадовай праграме 2021—2025 гадоў. Трэба адзначыць перш за ўсё істотныя якасныя змены і выкананне нашых абавязацельстваў. У першую чаргу гэта датычыцца камфортнага жыцця нашага насельніцтва. Рэальныя даходы выраслі больш чым на 23 %, і гэта сапраўды вельмі важны фактар, — сказаў Юрый Чабатар.

## У тэму

### БЕЛСТАТ: РЭАЛЬНЫЯ НАЯЎНЫЯ ГРАШОВЫЯ ДАХОДЫ БЕЛАРУСАЎ З ПАЧАТКУ ГОДА ВЫРАСЛІ НА 10 %

Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Рэспублікі Беларусь у студзені — кастрычніку 2025 года склалі 110 % да аналагічнага ўзроўню 2024-га.

У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 66,3 %, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву) — 21,9 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,4 %, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,4 %.

Дарэчы, грашовыя даходы прадстаўлены за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэкціраваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.

ЗІМОВЫ ТУРЫЗМ

# СТАЎКА НА ЎТУЛЬНАСЦЬ

## Экспарт турпаслуг значна павялічыўся

Сёлета ён вырас больш чым на 44 %, а ў грашовым вылічэнні ўвогуле дасягнуў рэкордных паказчыкаў за апошнія 10 гадоў — больш за 330 мільёнаў долараў. Як адзначаюць спецыялісты, з надыходам зімы і напярэдадні святочнага сезона ў Беларусі вырас попыт як на ўнутраны, так і на ўязны турызм. Куды ж едуць вандроўнікі?



### ВЯЧОРКІ КАЛЯ КАМІНА І ХАТНЯЯ КУХНЯ

Зімой у Беларусі прапануецца мноства магчымасцяў для разнастайнага адпачынку. Замкі і палацава-паркавыя комплексы цудоўныя ў любое надвор'е. Да таго ж у зімовы сезон яны прапануюць разнастайныя тэатралізаваныя экскурсіі, рыцарскія турніры, майстар-класы па танцах у сярэднявечным стылі. Падрыхтаваны спецыяльныя калядныя маршруты — у першую чаргу гастранамічныя туры з дэгустацыямі мясцовай кухні, а таксама гарадскія маршруты з наведваннем музеяў, выставак і іншых мерапрыемстваў. Не адстаюць аб'екты гандлю, якія да навагодняга і святочнага сезона адкрываюць кірмашы, праводзяць інтэрактыўныя мерапрыемствы, устанаўліваюць інсталяцыі для прыгожых фотасесій.

Класічным варыянтам для зімовага адпачынку застаецца наведванне Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» з рэзідэнцыяй Дзеда Мароза. Пры гэтым, як паведаміла **намеснік дырэктара — начальнік аддзела планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Кацярына ГАНЧАРОНАК**, Нацыянальнае агенцтва па турызме падрыхтавала каляндар падзейных мерапрыемстваў на зіму, дзе можна азнаёміцца з альтэрнатыўнымі варыянтамі навагодняга падарожжа.

Вялікі попыт на свае паслугі адчуваюць санаторыі: сярэдняя іх запаўняльнасць ужо перавышае 86 %. А на навагоднія святы — з 25 снежня па 7 студзеня — плануецца стопрацэнтная загрузка, прычым замежнікі складаюць палову гасцей. А вось пасля зімовых свят загрузка традыцыйна зніжаецца. Так што , хто не паспеў адпачыць у святочны перыяд, спяшайцеся ўзяць водпуск і адправіцца ў санаторый.

Асаблівай папулярнасцю ў зімовы сезон карыстаецца аграэкатурызм, дзе можна ўтульна адпачыць маленькай кампаніяй ці ўсёй сям'ёй. Аграсядзібы робяць стаўку на ўтульнасць — каміны, хатнюю кухню, лазневыя комплексы, гульні, знаёмства з гаспадаркай і майстар-класы, у тым ліку кулінарныя. Дарэчы, у снежні ў нашай краіне працягваецца месяц гастранамічнага турызму. У рэспубліцы працуе каля 200 аб'ектаў грамадскага харчавання, якія спецыялізуюцца на нацыянальнай беларускай кухні, а таксама каля 80 маршрутаў з гастранамічнай тэматыкай.

### ЛОШЫЦКІЯ КАЗКІ І КІРМАШЫ

У навагоднюю праграму Мінска ўваходзіць больш за 100 мерапрыемстваў. Цэнтральнай пляцоўкай стане прастора каля Палаца спорту, а з 20 снежня па 11 студзеня будзе працаваць калядны кірмаш. Новая лакацыя — Лошыцкі парк, дзе кожныя выхадныя з 20 снежня будуць праходзіць тэатралізаваныя паказы «Лошыцкія казкі». Навагоднімі паказамі парадуюць пляцоўка ў Верхнім горадзе з «Сакрэтамі навагодняга настрою» і штодзённая казка каля Палаца спорту «Таямніца навагодняй паштоўкі» ў 19.00. Акрамя таго, у кожным раёне сталіцы прадугледжаны свае калядныя мерапрыемствы.

— Гэты год стаў знакавым для развіцця дзённага выставачнага турызму. У маі адкрыўся Мінскі міжнародны выставачны цэнтр. З 19 снежня там стартуе вялікая выстаўка дасягненняў «Мая Беларусь», дзе чырвонай ніткай будзе прадстаўлены турыстычны патэнцыял не толькі Мінска, але і ўсёй краіны. Стэнд сталіцы будзе шырокім з інтэрактыўнай праграмай, майстар-класамі, віктарынамі і актыўнасцямі. Выстаўка працягнецца да 23 лютага, — расказаў **дырэктар дзяржаўнай установы «Інфармацыйна-турысцкі цэнтр «Мінск» Аляксей РУСАКЕВІЧ**.

Сталіца гатова да навагодняга наплыву гасцей, у тым ліку і замежных. У Мінску працуе 58 гасцініц з улікам той, што адкрылася пасля рэканструкцыі, на 13 нумароў у Лошыцкім парку, а таксама 19 хостэлаў. Агульная ўмяшчальнасць перавышае 12,7 тысячы месцаў, і сфера сродкаў размяшчэння прадаўжае бесперапынна развівацца. У бліжэйшыя дні плануецца адкрыць буйны аб'ект — гасцініцу Waldorf Astoria у цэнтры горада.

Функцыянуе вялікая колькасць рэстаранаў і кафэ, якія прапануюць разнастайныя паслугі і прадукцыю ў адпаведнасці з чаканнямі турыстаў. Ва ўстановах прапуюць афіцыянты з веданнем замежных моў, прапануецца меню на некалькіх мовах, выкарыстоўваюцца тэхнікі ўважлівага абслугоўвання і рэкамендацыі, ствараючы даверлівую атмасферу для гасцей. Таксама суб'екты грамадскага харчавання актыўна развіваюць фарматы фудзон і фудкортаў.

Каляндар зімовых падзей насычаны шмат чым цікавым: напрыклад, у студзені плануюцца мерапрыемствы, прысвечаныя традыцыйным святам — Калядам, Вадохрышчу, а ў лютым — Масленіцы. Прычым неабавязкова ехаць далёка, таму што ў кожным раёне пройдуць свае ўнікальныя дзействы.

**Алена КРАВЕЦ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1. Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8.**

**Торги состоятся 12 января 2026 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия пользования:** для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) | | | |
| 1 | **Помещение площадью 14,5 кв. м** в капитальном строении – здание специализированное связи с инв. № 340/С–28644, помещение на 3-м этаже. Адрес: г. Речица, ул. Советская, 66. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0. | **68,04** | 68,04 |
| 2 | **Помещение площадью 35,4 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 4-м этаже. Адрес: г. Речица, ул. Советская, 66-2. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0 | **166,12** | 166,12 |
| **Размер штрафа:** 5 % от начальной стоимости лота | **Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %** | | |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с продавцом по тел. 8 (0232)79-69-76.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель** – назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1, № 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 декабря 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 09 января 2026 г. в 16.00 включительно.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.**

**Необходимые документы:** юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 16 мая 2023 г. № 138 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.ocenkaservis.by в разделе «Аукционы» – «Очные торги»;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# ВЫРАЗНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ І КРОКІ

**«Праграма скіравана на адно — каб праз пяць гадоў беларусы жылі багацей»: эксперты — аб Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады**

Як распрацоўвалі Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2026—2030 гады, якая плануецца да зацвярджэння на другім пасяджэнні VII Усебеларускага народнага сходу, на што арыентавана праграма і якія механізмы будуць фінансаваць выкананне ключавых задач для эканомікі на наступныя пяць гадоў, расказалі эксперты.

## ЗАДАЧЫ І ПРЫЯРЫТЭТЫ

Дарэчы, работа над Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця вялася больш за год.

— Мы прыступілі да яе распрацоўкі ў чацвёртым квартале 2024 года. Спачатку трэба было сфарміраваць канцэпцыю — асноўныя палажэнні і падыходы, на аснове якіх будавалася ўся праграма. Каб прыцягнуць меркаванні экспертаў, мы вывучалі пазіцыі навуковай супольнасці, даручэнні кіраўніка дзяржавы па навуцы і бізнесе, размаўлялі з дзяржаўнымі органамі аб іх бачанні развіцця на пяць гадоў наперад, — расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання Міністэрства эканомікі Аляксей ЗУБОВІЧ**.



— Калі канцэпцыя сфарміравалася, на яе аснове ўжо распрацоўвалі саму праграму. Па сутнасці, мы ўпершыню зрабілі так, што канцэпцыя стала асновай самой праграмы — прапрацавалі яе вельмі дэталёва.

Затым праграму напоўнілі новым зместам. Важнай падзеяй сталі выбары Прэзідэнта: ён пазначыў свае пасылы аб развіцці Беларусі, і насельніцтва іх падтрымала.

— Мы ўлічылі гэтыя ідэі — з інаўгурацыйнай прамовы, перадвыбарных выступленняў і сказаных на дарогу слоў падчас прызначэння ўрада — і дапрацавалі праграму адпаведна. Пасля гэтага Прэзідэнт вырашыў яшчэ раз уважліва праглядзець дакумент разам з экспертамі, навуковай супольнасцю і дэлегатамі УНС. Стварылі рабочую групу, якая праверыла праграму і ўнесла неабходныя карэкціроўкі, — удакладніў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Аляксей Зубовіч пералічыў, якія менавіта дапрацоўкі былі зроблены.

— У асноўным яны закранулі дадатковыя прыярытэты, перш за ўсё ў сферы абароны. Таксама ўвялі асобны блок па маладзёжнай палітыцы і скарацілі колькасць індыкатараў.

У праекце праграмы на будучую пяцігодку вызначана некалькі ключавых прыярытэтаў. Асноўныя з іх звязаны з развіццём чалавека: дэмаграфічная бяспека, развіццё чалавечага патэнцыялу, стварэнне спрыяльнага і якаснага асяроддзя для жыцця. Далей ідуць развіццё канкурэнцыі, тэхналогій, лічбавізацыі эканомікі. А яшчэ сярод прыярытэтаў — моцныя рэгіёны, развіццё абароннага сектара, павышэнне абараназдольнасці краіны, а таксама турыстычны патэнцыял.

## МЕХАНІЗМЫ РЭАЛІЗАЦЫІ

Для рэалізацыі задач прадугледжаны ўсе даступныя механізмы фінансавання і падтрымкі — як за кошт бюджэту, так і з удзелам прыватнага сектара. Дзяржаўныя праграмы ў першую чаргу накіраваны на выкананне сацыяльнай функцыі дзяржавы: гэта будаўніцтва і рамонт інфраструктуры, дарог, развіццё сацыяльных аб'ектаў, арэнднае жыллё і іншыя праекты, што ствараюць базавыя ўмовы для жыцця людзей і работы бізнесу.

— Прыватны сектар актыўна задзейнічаем у інвестыцыйных праектах, каб забяспечыць прыярытэтнае выкананне дзяржаўных задач. Для гэтага распрацавалі спецыялізаваны крэдытны прадукт — да 7 гадоў з ільготнымі стаўкамі 6-7 %. Ён ахоплівае тэхналагічнае развіццё, падтрымку рэгіёнаў і новы прыярытэт — рэалізацыю турыстычнага патэнцыялу, — расказаў Аляксей Зубовіч.

Павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў і паслуг на знешніх рынках грунтуецца на стварэнні запатрабаванай прадукцыі.

— Гэта асобны прыярытэт: развіццё канкурэнцыі, тэхналагічнай устойлівасці і лічбавізацыі. Ключавое — запуск новых галін эканомікі, такіх як самалётабудаванне, маштабаванне вытворчасці робатаў і беспілотных сістэм, фармацэўтыка, мікраэлектроніка. Гэтыя кірункі запатрабаваны ў свеце, і мы плануем канкурыраваць на глабальных рынках, адначасова павышаючы ўнутраную канкурэнтаздольнасць, — звярнуў увагу начальнік галоўнага ўпраўлення.









## «НІЯКІХ АБЯЦАННЯЎ ПРА ЯХТЫ»

**Старшыня праўлення Беларускага таварыства «Веды» Аляксей АЎДОНІН** адзначыў, на што арыентавана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2030 года.



Эксперт расказаў, што распрацоўшчыкі праграмы работу на наступную пяцігодку выканалі вялікую работу, каб улічыць усе фактары, зрабіць праграму аб'ектыўнай і адпаведнай сусветным тэндэнцыям.

— Сусветны рынак перажывае крызіс перавытворчасці і структурныя змены. Нам трэба выбудаваць вытворчасць так, каб напаўняць унутраны рынак і развіваць эканоміку нават без знешняга попыту, пры гэтым заставацца канкурэнтнымі на глабальных рынках — прадукцыя павінна прысутнічаць ва ўсіх рэгіёнах. Для гэтага спатрэбяцца велізарныя намаганні: зніжэнне сабекошту праз сучасныя тэхналогіі, аптымізацыя кіраўніцкіх рашэнняў, зніжэнні бюракратыі і гэтак далей, — звярнуў увагу ён.

Службовыя асобы і ведамствы скрупулёзна вывучылі як нашы сацыяльна-эканамічныя працэсы, так і сусветную эканоміку.

— Яны стварылі комплексную Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяць гадоў з прыярытэтамі, вельмі важнымі для насельніцтва. Праграма скіравана на адно — каб праз пяць гадоў беларусы жылі багацей, — сказаў эксперт. — Параметры, кірункі і прыярытэты даюць выразныя інструменты і крокі, ніякіх абяцанняў пра самалёты, яхты, дамы і фабрыкі для ўсіх да 2030 года — усё гранічна канкрэтна і рэалістычна. Галоўная мэта — забяспечыць грамадзянам упэўненасць у заўтрашнім дні не толькі на дзень наперад, а на перспектыву да 2030 года.

Эксперт звярнуў увагу: вядомы брытанскі часопіс The Economist, які кіруецца глабалістамі, прагназуе 2026 год як час нявызначанасці, росту ваенных канфліктаў і сутыкненняў.

— Мы ж на парозе гэтага года кажам адваротнае: у нас усё будзе стабільна, праграма развіцця працуе, узрушэнняў не прадбачыцца, — заўважыў ён.

У гэтай сувязі ключавым новаўвядзеннем у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі да 2030 года стаў менавіта блок па бяспецы.

— Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў на нарадах: нельга займацца эканомікай і мірнай працай, калі на граніцах і ўнутры краіны ёсць пагрозы: вайна, унутраныя канфлікты, ціск НАТА. Бяспека дазваляе спакойна развіваць грамадства, але яна шырэйшая за чыста ваенны аспект. Гэта абарона гандлёвых шляхоў, лагістычных ланцужкоў, фінансавых транзакцый — усяго знешняга контуру эканомікі, бо без яго нацыянальная эканоміка не зможа дасягнуць высокага росту, — адзначыў Аляксей Аўдонін.

Беларусь, як экспартна-арыентаваная краіна, праводзіць палітыку абароны сваіх інтарэсаў.

— Адсюль прадукцыйныя візіты Прэзідэнта ў Расію, на Блізкі Усход, у Афрыку і Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён — для кантрактаў і дамоўленасцяў, якія забяспечаць рэалізацыю праграмы. Яна не фармальнасць — чыноўнікі яе старанна прапрацавалі, — але цяпер патрабуе жорсткай практычнай імплементацыі, — сказаў на заканчэнне эксперт.

## ЭКАНОМІКА — ГАРАНТЫЯ ПЕРААДОЛЕННЯ ПРАБЛЕМ

**Эксперт у галіне нацыянальнай бяспекі, афіцыйны прадстаўнік РГА «Белая Русь» Аляксандр ЦІШЧАНКА** расказаў, якія пытанні нацыянальнай бяспекі будуць абмяркоўвацца на другім пасяджэнні VII Усебеларускага народнага сходу.



У красавіку мінулага года на першым пасяджэнні VII УНС прынялі Ваенную дактрыну і канцэпцыю нацбяспекі, нагадаў ён.

— Другое пасяджэнне выходзіць на практычную плоскасць: калі тады ішлі размовы аб сістэме поглядаў і прынцыпах, то цяпер у нас ёсць канкрэтны план абароны на пяць гадоў. Гэта значыць, мы дакладна ацэньваем абстаноўку, разумеем сітуацыю і ведаем, што рабіць, — адзначыў Аляксандр Цішчанка.

Становішча каля нашых граніц не становіцца лягчэйшым, падкрэсліў ён.

— Раней пагрозы былі гіпатэтычнымі: ці будзе вайна? А сёння яны рэальныя. На паўднёвых граніцах ужо ідзе вайна, заходнія і паўночныя суседзі ўпалі ў мілітарысцкую агонію і рыхтуюцца да канфлікту. Як сказаў Прэзідэнт, калі хтосьці да гэтага рыхтуецца, значыць, на гэта і разлічвае, — падкрэсліў эксперт. — Канцэпцыя і дактрына былі прыняты своечасова — яны ўлічваюць усе рызыкі, выклікі і пагрозы вакол нас.

Усё ўпіраецца ў эканоміку: гісторыя войнаў паказвае, што перамагаюць толькі моцныя эканомікі, звярнуў увагу Аляксандр Цішчанка.

— Савецкі Саюз, які выстаяў супраць усёй Еўропы дзякуючы менавіта эканамічнай моцы, — яскравы прыклад. Сёння мы вымушаны ўдзяляць эканоміцы яшчэ больш увагі з-за пагроз ад суседзяў і Захаду. Першае, што яны спрабуюць знішчыць, — нашу эканоміку праз санкцыі і ціск. Але эканоміка — гарантыя нашага выжывання і пераадолення праблем. У адрозненне ад заходніх апанентаў, якія шукаюць гаспадароў, мы шукаем партнёраў. Санкцыі не спыняюць нас, а даюць старт для руху наперад, — упэўнены ён.

**По матэрыялах БелТА, фота БелТА.**

---

БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# «МЫ — МОЦНАЯ НАЦЫЯ, АЛЕ НАМ ТРЭБА СТАЦЬ ЯШЧЭ МАЦНЕЙШЫМІ»

**Планы на пяцігодку амбіцыйныя, але калі возьмемся ўсе разам — усё атрымаецца**

Дэлегаты УНС з рэгіёнаў сёння з раніцы ўжо накіраваліся ў сталіцу, дзе пачынаецца найважнейшая падзея гэтага года — другое пасяджэнне сёмага Усебеларускага народнага сходу. Напярэдадні нашы карэспандэнты на месцах пацікавіліся, з якімі меркаваннямі і настроем народныя прадстаўнікі едуць на Сход, на якім будуць прымацца вызначальныя для ўсёй краіны рашэнні.





**Дэлегат УНС, член Савета Рэспублікі, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ:**



— Усебеларускі народны сход, які атрымаў канстытуцыйны статус, даказаў сваю ролю як вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, гаранта палітычнай стабільнасці, суверэнітэту і грамадзянскай згоды.

Цэнтральнай падзеяй пасяджэння стане зацвярджэнне Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады. Праграма — гэта не проста набор паказчыкаў. Гэта «адзіны дакумент аб будучыні краіны», які павінен быць зразумелы кожнаму грамадзяніну. Асабліва важна, што ў яе аснове ляжаць прыярытэты, накіраваныя на захаванне народа і развіццё чалавечага капіталу. Яны наўпрост адказваюць на галоўныя выклікі часу. Як урач я асабліва падкрэсліваю, што здароўе нацыі і дэмаграфічная бяспека — гэта падмурак, без якога немагчымыя ні тэхналагічны прарыў, ні эканамічны рост.

**Дэлегат УНС, старшыня Аршанскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Зінаіда ХАЙЧАНКА:**



— Беларусь ідзе па шляху развіцця. Многае ўжо зроблена для паляпшэння якасці нашага жыцця, але наперадзе яшчэ шмат работы. Патрабуецца аналіз вынікаў і выпрацоўка задач на новы перыяд. Усебеларускі народны сход стане галоўнай пляцоўкай, на якой мы разам будзем выпрацоўваць стратэгію і тактыку далейшага жыцця. Вельмі важна, што скажа Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. На парадак дня выносіцца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады, якая пасля прыняцця стане законам для далейшай работы ўсіх дзяржаўных органаў і арганізацый. Самае галоўнае, што ў праграме, у кожным яе пункце ў цэнтры ўвагі, заўсёды быў і будзе чалавек. Як прадстаўнік старэйшага пакалення, лічу, што вялікую ўвагу трэба ўдзяляць выхаванню моладзі. Каб яны любілі сваю Радзіму, ганарыліся тым, што зрабілі для іх бацькі і прадзеды, паважалі іх ратную і баявую працу, умацоўвалі суверэнітэт і незалежнасць краіны ў будучыні.

**Дэлегат УНС, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый ПЯТРУША:**



— Праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і яе ключавыя прыярытэты зразумелыя і празрыстыя. Сфарміраваны каркас для яе наступнай рэалізацыі: дзяржаўныя, галіновыя, рэгіянальныя, навуковыя праграмы.

Пяцігодка — даволі-такі невялікі адрэзак часу, а планы намечаны амбіцыйныя. Аднак пры прыкладанні намаганняў пасільныя. Задзел для рэалізацыі многага зроблены ў бягучай пяцігодцы і не будзе кінуты, а атрымае паслядоўнае развіццё.

Напрыклад, адзін з кірункаў дзейнасці, якую я курырую, — будаўніцтва. Згодна з праектам Праграмы, акцэнт у бліжэйшыя пяць гадоў будзе зроблены на ўзвядзенне арэнднага жылля ў тых рэгіёнах, якія развіваюцца, дзе ёсць запыт на новую жылплошчу для запатрабаваных спецыялістаў. Гэта стане адным з механізмаў іх прыцягнення і замацавання ў пэўнай мясцовасці.

**Дэлегат УНС, генеральны дырэктар ААТ «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання» Руслан СТРАХАР:**



— У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця асаблівае значэнне надаецца рэальнаму сектару эканомікі. Лічу, што яго паспяховае функцыянаванне заключаецца ў плённым супрацоўніцтве навукі і прамысловасці. Менавіта пра гэта і гаворыць наш Прэзідэнт. Развіццё краіны непарыўна звязана з укараненнем перадавых тэхналогій, стварэннем новага прадукту. Але найперш хацеў бы адзначыць, што пераемнасць — гэта вельмі важны момант развіцця ў сучаснай гісторыі Рэспублікі Беларусь. Вось тыя асновы, якія былі закладзены ў папярэдняй праграме ў дачыненні да развіцця прамысловасці, дазволілі нам — і гэта відавочна — выстаяць у перыяд санкцый і знешняга ціску на нашу краіну. Што да перспектыў, то ў прынцыпе тыя ж асновы, але больш мадэрнізаваныя будуць пакладзены ў нашу новую праграму. Развіццё рэальнага сектара эканомікі — гэта ўкараненне сучасных тэхналогій, стварэнне новага прадукту, пашырэнне экспартных рынкаў. Для падтрымкі інавацый у нашай краіне ўжо ёсць інструменты, якія працуюць, а таксама будуць з'яўляцца новыя, якія дазволяць інавацыйна арыентаваным прадпрыемствам, якія накіраваны на ўдасканаленне сваёй тэхналогіі, на распрацоўку і ўкараненне тэхналогій, рабіць гэты працэс як мага больш аптымальным, зручным для прадпрыемства.

**Дэлегат УНС, загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва і рамёстваў Карэліцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Юлія БАЯРЭНКА:**



— УНС — гэта форма народаўладдзя, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў, усіх слаёў грамадства, якая дазваляе пачуць голас большасці грамадзян нашай краіны. Вельмі ганарова быць часткай гэтай каманды. Мяне як прадстаўніка сферы культуры хвалююць пытанні захавання, развіцця і папулярызацыі нашай нацыянальнай культуры. Безумоўна, за апошнія дзесяцігоддзі зроблена нямала: дзяржава актыўна фінансуе і падтрымлівае захаванне гістарычнай культурнай спадчыны, у тым ліку фальклор, традыцыі і нацыянальныя святы. Ажыццяўляецца праграма па рэканструкцыі і пераснашчэнню дзяржаўных тэатраў, музеяў і іншых культурных аб'ектаў, прымаюцца дзяржаўныя праграмы, напрыклад «Культура Беларусі», якая вызначае стратэгічныя кірункі развіцця і фінансавання культурнай сферы. Нельга не адзначыць той факт, што сёння культура мае і ідэалагічную ролю, бо разглядаецца як важны інструмент для ўмацавання адзінства нацыі і перадачы традыцыйных каштоўнасцяў, такіх як працавітасць, любоў да Радзімы і міралюбнасць.

**Дэлегат УНС, намеснік старшыні Мазырскага раённага Савета ветэранаў, Вольга АРЦЁМЕНКА:**



Пачынаючы з першага, мне пашанцавала быць дэлегатам чатырох УНС запар. І цяпер ізноў у маім жыцці такая вялікая місія: быць дэлегатам VII УНС, дзе прадстаўляю Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, сваю родную Мазыршчыну і раённы Савет ветэранаў, які аб'ядноўвае больш за 20 тысяч чалавек. Знакавы, перакананая, і пасыл VII Усебеларускага народнага сходу — «Час выбраў нас». Гэта яшчэ раз падкрэслівае, што сёння кожны дэлегат, кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь абавязаны ўносіць свой уклад у развіццё сацыяльна-эканамічнай сферы краіны.

Дагэтуль вельмі моцныя ўражанні ад удзелу ў першым пасяджэнні VII УНС. Такога фармату размовы са сваёй краінай, са сваім народам няма ні ў адной дзяржаве свету. Адчуванне такое, што Прэзідэнт звяртаецца не толькі да свайго народа, палітыкаў, кіраўнікоў усіх узроўняў, але і да самога сябе. Галоўная для мяне як дэлегата выснова: мы павінны ганарыцца сваёй Беларуссю яшчэ больш, ганарыцца сваім Прэзідэнтам, рабіць усё, каб краіна жыла. Неаднаразова Аляксандр Рыгоравіч звяртаўся ў выступленнях да ветэранаў. Нагадваў аб нашай гісторыі, падкрэсліваў: самае важнае, што мы змаглі захаваць, — гэта найлепшыя традыцыі Савецкага Саюза. Нам удалося адстаяць краіну! Так, ёсць праблемы, але мы яшчэ так добра, як цяпер, ніколі не жылі. Мы — моцная нацыя, моцныя духам, але нам трэба стаць яшчэ мацнейшымі. Калі знаёмлюся з дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, у чарговы раз пераконваюся, якія цудоўныя маладыя людзі растуць у нашай краіне. І вельмі важна не губляць сувязі пакаленняў.

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

ПА СУТНАСЦІ

# СТРАТЭГІЧНАЯ ПЛАНЁРКА ДЗЯРЖАЎНАГА МАШТАБУ






Супярэчнасці ёсць у любой краіне. Жыццяздольнасць дзяржавы залежыць ад механізмаў вырашэння гэтых супярэчнасцяў. У нас такі механізм ёсць — Усебеларускі народны сход.

Часам дэмакратыя ператвараецца ў палітычную дэмагогію. Каб не разводзіць яе, варта выкарыстоўваць выключна факты. Аб гэтым сведчыць геапалітычны досвед менеджменту з выбаркай планетарнага маштабу. Антычная полісаманія скончылася Фермапіламі. Шляхецкія вольнасці імперыі еўрапейскага міжрэчча — Рэчы Паспалітай — «пецярбургскімі канвенцыямі»: «фанабэрыстае крулеўства» было падзелена на такія лапікі, што нават чыншавая шляхта калядныя пірагі не рэзала.

А зараз як? А цяпер замест тусоўкі скамечанага Давоса, закрытага цяжкімі цёмнымі шпалерамі Більдэрберга і замшэлага Рымскага клуба, які «пазелянеў» ад запалу да экалогіі, ёсць асобныя апартаменты. За асобны столік лорды ў фраках, сэры ў авечых кажухах запрасілі лічбавых мільярдэраў у касцюмах пад макасіны. Постмадэрнізм. Ва ўсім. У філасофскай думцы таксама. Цэлыя філасофскія школы спрабуюць абгрунтаваць «новыя нармальнасці». А марыянетачныя байдэны, агрэсіўныя мерцы і выкрутлівыя макроны — кіраваць народамі і краінамі.

Калектыўны Сорас зросся з калектыўным Ротшыльдам, у іх жа кампаніі — калектыўны Цукерберг. Залаты тандэм. «Сусветная эліта» вызначаецца не толькі па блакіце крыві, але і па валоданні інфармацыяй, часам самай цікавай і загадкавай, яны зрасліся з уладальнікамі сусветных грошай і лічбавых сетак. Насамрэч «пачвара».

У нас усё інакш. І аб'яднанне дзвюх частак адзінай Беларусі таксама прайшло «з благаславення» народнага сходу. Такая гістарычная сутнасць цяперашняга УНС. Свой міралюбівы фон сход беларусаў узмацніў у 1996-м. У найцяжэйшыя гады станаўлення краіны ініцыятарам народнага веча стаў Прэзідэнт. Параіцца з беларусамі па самых складаных пытаннях, выпрацаваць стратэгію развіцця. Ды проста без сацыялагічных хібнасцяў — пачуць грамадства. Цяпер УНС — ва ўмовах адкрытай знешняй канфрантацыі і геапалітычнай турбулентнасці — найвышэйшы прадстаўнічы орган з канстытуцыйным статусам і дадатковымі паўнамоцтвамі.

Якой па змесце быць форме народаўладдзя, прапанавалі заканадаўцы. А потым з тлумачэннямі афіцыйныя асобы паехалі «ў народ». Узор народаўладдзя. Сцяжынка пракладзена — гэтак жа збіралі канстытуцыйныя папраўкі. У выніку ідэі кожнага будуць увасоблены ў агульным дакуменце. Зразумела, усе ініцыятывы пераглядзяць, прааналізуюць, каб улічыць інтарэсы ўсіх і перш за ўсё дзяржавы.

УНС ставіць выразную кропку ва ўсіх спрэчках. Каб перамены, грамадскі дыялог адбываліся не па інструкцыях дэструктыўных і чужаземных ТГ, краіна павінна развівацца па беларускім сцэнарыі. Без мардабою і «батлаў» з сілавікамі. Прадумана, размерана, памяркоўна, як мы любім казаць.

Падчас канстытуцыйных змен такая форма народаўладдзя здала іспыт на падтрымку грамадства. Цяпер модна казаць — «грамадзянская супольнасць». Прэзідэнт на кожнай нарадзе па некалькі разоў падкрэсліваў: УНС — гэта не элітарны пленум; гэта пляцоўка, на якой сустракаецца ўся Беларусь. Зрэз усяго грамадства.

Гэта самая што ні на ёсць стратэгічная планёрка дзяржаўнага маштабу. У адным месцы штогод збіраюцца ўсе: вышэйшыя службовыя асобы, адказныя за развіццё ўсіх галін і сфер; давераныя асобы ад народа; тыя, хто прымае законы і тыя, хто сочыць за выкананнем законаў. А галоўнае — усе мы: настаўнікі, урачы, аграрыі, завадчане, айцішнікі, навукоўцы, журналісты, актывісты грамадска-палітычнага жыцця, эксперты.

Без таксічных пастоў у сацыяльных сетках, прама ў вочы адзін аднаму — аб набалелым, важным, галоўным. Што яшчэ можа быць больш дэмакратычным? Я нават не ўяўляю, каб кангрэсмены ЗША абмяркоўвалі важныя рашэнні з фермерам з Ілінойса ці слесарам з Дэтройта. Або, напрыклад, каб у Вестмінстэрскім палацы разам з лордамі і пэрамі сядзела б шматдзетная маці або малочніца з Уэльса. У нашым УНС так і будзе. Вось — Прэзідэнт, а вось — камбайнер. Раз у год — абавязкова (а калі спатрэбіцца, то і часцей) — сабраліся, дамовіліся, раз'ехаліся ўвасабляць у жыццё.

Каб не было ў краіне майданных пажарышчаў «васільковых рэвалюцый», ад уплыву заморскіх пачвар у нас ёсць прылада палітычнага экзарцызму. УНС — орган стратэгічных рашэнняў. Бацькам Сходу як стратэгічнага інструмента дзяржаўнага кіравання стаў Прэзідэнт. Гістарычна і палітычна да гэтага трэба было пасталець, дайсці. Ад адзінаначалля — да такога калегіяльнага органа. Прычым без адчувальных узрушэнняў, а спакойна, менавіта па-беларуску. За апошнія дзесяцігоддзі такі сур'ёзны апгрэйд палітычнага ўкладу краіны невядомы свету.

Сёння ў вялікай зале ўбачым кожны сябе. Гэта і будзе Беларусь у мініяцюры, кансалідаваная адказнасць за краіну. УНС — тры літары, у якіх тры прычыны для нацыянальнага гонару. Першая — уласна ўнікальная ідэя рэалізацыі вялікага народаўладдзя, другая — шлях увасаблення, ён філігранны, трэцяя — выпрабаванне. Здавалася б, у складаны перыяд самы час узмацніць жорсткасць персаніфікаванай цэнтралізацыі, але ў нас поўным ходам ідзе рэалізацыя ўнікальнага праекта народаўладдзя. Гэта сведчыць толькі аб адным: аб моцнай мадэлі нашай дзяржавы, якая прайшла (і праходзіць) самую жорсткую і бескампрамісную праверку часам. Нездарма ж з падачы Першага пайшло крылатае: час выбраў нас!

**Яўген ПУСТАВОЙ, дэлегат УНС.**


















Фота БелТА і Лізаветы ГОЛАД.

# КАЛЕКТЫЎНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ УСІХ САЦЫЯЛЬНЫХ ГРУП

## Вырашаць важныя для народа пытанні разам — традыцыя беларусаў



Так лічыць дэлегат УНС, доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК і праводзіць цікавую паралель з падзеямі больш чым стагадовай даўнасці:

— Усебеларускі народны сход — гэта калектыўная адказнасць прадстаўнікоў усіх сацыяльных груп, якія сваімі ж суграмадзянамі надзелены паўнамоцтвамі вызначаць будучыню краіны. Здаецца, што гэта маладая традыцыя. Насамрэч, гэта не так. Калі не гаварыць пра Полацкае веча, а пра рэчы больш блізкія і прадметныя, то варта ўзгадаць І Усебеларускі з'езд 1917 года. Менавіта тады, калі Беларусь разрывалі на часткі, калі была пагроза нашай тэрытарыяльнай цэласнасці, увогуле стаяла пытанне, ці будзе існаваць беларуская дзяржаўнасць, беларусы знайшлі ў сабе сілы і волю, стварылі аргкамітэт, заручыліся падтрымкай у тым ліку Леніна і Сталіна і правялі ў снежні 1917 года ў Мінску Усебеларускі з'езд. На ім былі прадстаўлены ўсе сацыяльныя групы беларусаў без выключэння. У тэатры імя Янкі Купалы, дзе праходзіў з'езд, былі ўсе: і акадэмік Карскі, і беларусы-генералы, а не толькі шэрыя шынялі і сялянскія світкі. Тое, што БССР потым узнікла і стала рэальнай формай савецкай беларускай дзяржаўнасці, было яшчэ і вынікам пазіцыі беларускіх бежанцаў. Тады мільённы беларускі голас заявіў, што няма Паўночна-Заходняга краю, а ёсць Беларуская рэспубліка, і яна павінна быць.

Для мяне Усебеларускі з'езд, як і УНС, — гэта сімвал беларускага адзінства. У 1917 годзе групы ўсіх палітычных арыентацый сабраліся для таго, каб вырашыць найважнейшую калектыўную справу. Усебеларускі народны сход — працяг той традыцыі. Аднак мы павінны шчыра сказаць: такія рэчы ўзнікаюць тады, калі існуе пэўная пагроза, прычым рэальная, існаванню краіны, яе суверэнітэту і эканамічнаму развіццю. Калі ўзгадаць гісторыю, то першы УНС (1996 год) па ініцыятыве Прэзідэнта вырашаў найважнейшыя праблемы: краіна была ў дзікім крызісе. Ключавыя пастулаты той праграмы — экспарт, харчаванне, жыллё. І калі агучваліся гэтыя рэчы, якія цяпер здаюцца натуральнымі, у гэта ніхто не верыў...

У выніку мы стварылі кіруемую дзяржаву, знішчылі арганізаваную злачыннасць, мы стварылі адзіны (не ў крыўду нікому) рэальна існуючы сярэдні клас, у нас мінімальны разрыў паміж даходамі самых багатых і самых бедных.

Нам з вамі пашанцавала жыць у вялікі гістарычны час, мы ствараем найноўшую гісторыю сваёй Радзімы. Гэта вельмі значны для Беларусі і беларусаў гістарычны перыяд — мы набылі сваю суверэнную дзяржаўнасць і за апошнія крыху больш за трыццаць гадоў мы даказалі ўсім, што Беларусь — самадастатковая, незалежная краіна, народ якой сам вызначае свой шлях, і суверэнная ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Гэта значыць, такія пытанні, як наша ўнутраная і знешняя палітыка, з кім нам сябраваць, як выбудоўваць нашы эканамічныя ўзаемаадносіны і палітычныя саюзы, вырашаюцца ні ў чужых «абкамах», ні ў нейкіх іншых краінах. Найважнейшы цэнтр прыняцця рашэнняў — гэта наш Мінск, наш Прэзідэнт, наш Урад, наш Парламент, наш Усебеларускі народны сход.



## Панядзелак, 22 снежня

### Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
8.15, 18.45 Зона X (16+).
9.15 Галоўны эфір.
10.50, 12.25 Меладрама «Каханне не па правілах» (16+).
13.15, 15.15 Меладрама «Дачушкі» (12+).
17.45 Беларуская часінка.
19.10 Меладрама «Без віны вінаватая» (12+).
20.55 «Фактар. BY».
21.00 Панарама.
21.50 Зразумелая палітыка.
22.05 Серыял «След» (16+).

### АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.10 «Белыя Росы» (12+).
12.40, 13.15, 22.55 Фільм «Вір» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «Час пакажа» (16+).
19.00 «Яшчэ не вечар» (16+).
20.10 Вячэрнія навіны.
21.20 «Прапаганда» (16+).
21.40 Фільм «Насланне» (16+).
1.05 «Твар у твар» (16+).

### СТБ

6.00, 6.45, 7.45, 8.45 «Інфармацыйная раніца».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Палітыка без гальштукаў і купюр».
10.20 «Слова і справа».
10.45 «Суровы погляд».
11.25 «Дарагія таварышы» (16+).
12.00 «Дэтэктыў на кончыку пяра». Серыял (16+).
13.50, 0.05 «БіМ-2». Серыял (16+).
16.50 «Міншчына».
17.00 «Хуткая дапамога — 4». Серыял (16+).
18.30 «Па сутнасці».
20.15 «Пытанні ад бландзінак».
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Шэф. Гульня на павышэнне». Серыял (16+).
23.20 «Жыццё зорак» (16+).

### МІР

5.00, 2.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
5.55, 10.10, 13.15 Тэлесерыял «Дыназаўр-2» (16+).
10.00, 13.00 Навіны.
16.10 Мастацкі фільм «Кур'ер» (16+).
18.00 Разам кожны дзень.
18.20 Мастацкі фільм «Дзе знаходзіцца нофелэт?» (16+)
20.00 Мастацкі фільм «Адзінокім даецца інтэрнат» (16+).
21.45 Мастацкі фільм «Самая абаяльная і прывабная» (16+).
23.25 Мастацкі фільм «Інтэрдзевачка» (18+).
3.15 Мультфільмы (12+).
4.00 Мастацкі фільм «Шосты» (16+).

### Першы Інфармацыйны

5.00, 6.05 Галоўны эфір (12+).
5.20, 8.50, 9.35, 12.50, 0.15 Баявое дзяжурства (12+).
5.30, 6.30 Навіны эканомікі (12+).
5.35, 6.35, 7.45, 8.40, 13.20 Прэс-агляд (12+).
5.40, 6.40 Меркаванне клуба (12+).
5.50, 8.55 Тэхнагайд (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.50 Громаў LIVE (12+).
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.35, 23.55, 3.45 Аўтарскі погляд (12+).
7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.50, 11.30, 11.55, 12.30, 13.25, 14.30, 15.30, 16.30, 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.35, 0.05, 0.35, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00 Навіны. Дайджэст.
7.50, 9.50 Сусветная навука (12+).
10.10 Вакол планеты (12+).
11.10, 11.35, 21.20 Тэлефільм (16+).
12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 18.10, 23.40, 3.30, 4.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
13.30 Твой горад (12+).
13.45, 15.15, 16.10, 18.40, 20.40, 22.20, 4.45 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
14.00, 17.20 Навіны. Мінск.
14.35, 16.35, 18.35, 1.10, 3.10 Дзень спорту.
19.35, 22.40, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15 Сфера інтарэсаў (12+).
20.05, 23.20, 0.40 Зразумелая палітыка (12+).
21.15, 22.15, 23.15 Тэма дня.
1.30, 2.30 Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 7.05, 8.05 «Новая раніца».
9.05, 10.05 Серыял «Шуша» (16+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Акцэнты». Выніковая аналітычная праграма.
12.40 «У пошуках ісціны».
13.30 Гумарыстычная праграма (16+).
13.45 «Плюс-мінус».
14.40 «60 хвілін».
16.30 «Аб самым галоўным» (12+).
17.40 «Ёсць пытанне з Вадзімам Гігіным».
18.45 «Малахаў» (16+).
21.30, 23.15 Серыял «Апошні волат. Спадчына» (12+).
0.15 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05 Беларусы (6+).
6.40 «Навука побач» (6+).
7.20, 8.25, 10.35 Фільм «Трэцяга не дадзена» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.05 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
13.20, 22.45, 23.45 Сёння. Галоўнае.
13.25 «Надзвычайнае здарэнне».
13.55 НЗ.BY:аператыўна (16+).
14.00 «За гранню» (16+).
15.00 «ДНК» (16+).
16.40, 20.00 Галоўнае. Сёння. Беларусь.
16.55 Фільм «Другое каханне» (16+).
20.15, 21.40 Серыял «Таемны саветнік» (16+).
21.20 «НЗ.by».
22.50, 0.00 Серыял «Вялікая вада» (16+).

### Беларусь 3

7.00 «Дабранакак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 13.00, 18.50, 20.30, 23.35 «Навіны культуры».
8.15, 19.00 «Апякун». Мастацкі фільм (12+).
9.45 «Вялікая сям'я». Мастацкі фільм (12+).
11.30 «Культурны тыдзень».
12.10 «Нацыянальны хіт-парад».
13.15, 21.05 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў». Мастацкі фільм (12+).
14.55 «Наперад у мінулае».
15.35 «Навука побач» (6+).
16.00 «Славянскі базар у Віцебску».
16.50 «Я — мастак, я так бачу!».
17.15 «Штрафны ўдар». Мастацкі фільм (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
22.55 «Легенды кіно» (12+).
23.50 «Люблю і памятаю».

### Беларусь 5

7.00 Хакей. Міжнародны турнір «Тэрыторыя хакея». Юнакі.
8.40 Вынікі тыдня.
9.20 Плаванне. Кубак Сальнікава.
10.45 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лада» (Тальяці).
12.25 Змешаныя адзінаборствы.
15.00 VeloLove.
15.15 Арэна.
15.45 Героі. Дзеці.
16.40 На мяжы фолу. Футбольны агляд.
17.55 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Барысфен» (Магілёў) — БК «Гродна-93». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
19.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — ХК «Брэст». У перапынках — «Спорт-цэнтр».
22.15 Агляд НХЛ.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Атлетык» (Більбаа) — «Эспаньёл».

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.25 Тэлебарометр.
10.05 Меладрама «Кабінет вандроўніка» (12+).
13.50 Смачна есці (12+).
14.35 Сямейныя гісторыі (16+).
15.05 «Барбоскіны ТЭАМ» (0+).
16.30 Усё ў парадку (12+).
17.05 «Рогаў у горадзе» (16+).
18.00 «100 месяцаў, дзе пасеці» (16+).
19.00 Меладрама «Падары мне надзею» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Серыял «Дзікі» (16+).
23.30 «Бітва шэфаў» (16+).

## Аўторак, 23 снежня

### Беларусь 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
8.15, 18.45 Зона X (16+).
9.15 «Здарова здаровым быць!» (6+)
10.05, 22.00 Серыял «След» (16+).
12.25, 0.15 «Скажынемаўчы».
13.20, 15.15 Меладрама «Бумеранг» (16+).
17.45 Беларуская часінка.
19.10 Меладрама «Без віны вінаватая» (12+).
20.55 «Фактар. BY».
21.00 Панарама.
21.50 Гэта іншае.

### АНТ

6.00, 7.15, 8.15, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
10.00 «Прапаганда» (16+).
10.20 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.15, 13.15, 22.35 Фільм «Вір» (16+).
15.00 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «Час пакажа» (16+).
19.00 «Месца на карце. Аман». (16+).
20.00, 0.45 Час.
21.20 Фільм «Насланне» (16+).

### СТБ

6.00, 6.45, 7.45, 8.45 «Інфармацыйная раніца».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00 «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
9.30 «Па сутнасці».
10.45 «Дарагія таварышы» (16+).
12.00 «Дэтэктыў на кончыку пяра». Серыял (16+).
13.50, 0.05 «БіМ-2». Серыял (16+).
16.50 «Міншчына».
17.00 «Хуткая дапамога — 4». Серыял (16+).
20.15 «Займальная паліталогія».
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Шэф. Гульня на павышэнне». Серыял (16+).
23.20 «Рускія таямніцы» (16+).

### МІР

5.00 Мастацкі фільм «Шосты» (16+).
5.20, 10.10, 13.15 Тэлесерыял «Дыназаўр-3» (16+).
10.00, 13.00 Навіны.
16.05 Мастацкі фільм «Сцеражыся аўтамабіля» (16+).
18.00 Разам кожны дзень.
18.20 Мастацкі фільм «Жаніцьба Бальзамінава» (16+).
20.05 Мастацкі фільм «Дванаццаць крэслаў» (16+).
